ПАДЗЕІ І ДАТЫ

# Міхасю СКРЫПКУ—75



Пісьменніку Міхасю Скрыпку 26 лістапада спаўняецца 75 год з дня нараджэння. Праўленне Саюза пісьменнікаў БССР накіравала яму віншаванне, у якім гаворыцца:

**«Дарагі Міхаіл Аляксандравіч!**

**Ад усяго сэрца вітаем Вас, аднаго са старэйшых беларускіх пісьменнікаў, у дзень Вашага 75-годдзя!**

**Вы пачыналі свой жыццёвы шлях у гады вялікіх сацыяльных пераўтварэнняў. Дзякуючы перамозе Кастрычніка, Вы, сын селяніна, як і дзеці ўсяго працоўнага народа, атрымалі магчымасць вучыцца і выбіраць сабе дарогу ў жыццё. Скончыўшы Рагачоўскі педагагічны тэхнікум, Вы настаўнічалі і вучыліся завочна на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.**

**У гады Вялікай Айчыннай вайны Вы са зброяй у руках змагаліся з ворагам — спачатку ў партызанах, а потым у Савецкай Арміі.**

**З ратнага поля Вы зноў вярнуліся на ніву народнай асветы, якая спрыяла і Вашай літаратурнай працы.**

**Пачынаючы з 1927 года, Вашы сатырычныя творы ўсё часцей з'яўляліся на старонках газет і часопісаў.**

**Ваш першы зборнік вершаў і баек «Сатыра і гумар» выйшаў з друку ў 1958 годзе. Потым былі выдадзены кнігі баек і мініяцюр «Сатырычны калаўрот» і «Ад смеху не ўцячэш».**

**Вашаму востраму пяру належаць зборнікі апавяданняў і гумарэсак «Мая хата не з краю», «Пад корань», «Усяк бывае», кніжка антырэлігійных нарысаў «Сцеражыцеся цемрашалаў». Вядомы Вы і як аўтар драматургічных твораў: камедыі «Чорт памог» і сцэнарыя кароткаметражнай тэлекамедыі «Акадэмік».**

**Не абышлі Вы сваёй увагай і маленькіх чытачоў, напісаўшы кніжку апавяданняў «Дзіва ў рэшаце» і вершаваны зборнік «Пад смешнай вясёлкай».**

**У сваіх творах Вы высмейваеце адмоўныя з'явы жыцця, чалавечыя хібы і заганы, якія замінаюць нашаму руху наперад.**

**Горача вітаючы Вас у дзень 75-годдзя, жадаем Вам, дарагі Міхаіл Аляксандравіч, моцнага здароўя, вясёлага жыццярадаснага настрою, творчых поспехаў!»**

Рэдакцыя штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» далучаецца да гэтага віншавання.

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА 26.XI.1982